# Што такое адзінства?

Дар'я Мерава, вучаніца XI класа, дзяржаўная ўстанова адукацыі "Канвелішская сярэдняя школа" Воранаўскі раён

Жыццё бяжыць, мяняюцца поры года, няспынна імкнецца наперад зменлівы час, які пакідае незабыўны след, то яркі, то шэры. Час усё лечыць, усяму вучыць… У яго плыні фарміруемся і загартоўваемся мы, маладыя беларусы. А душу і сэрца напаўняюць моманты, якія і складаюць наша жыццё, робяць яго асэнсаваным і запамінальным.

"Што такое адзінства?" – вызначальнае пытанне для беларусаў, важнае, выключнае. Паспрабую яго асэнсаваць праз тыя жыццёвыя моманты, якія сталі значнымі для мяне, шаснаццацігадовай дзяўчыны, выпускніцы сярэдняй школы.

**Адзінства – гэта аб'яднанне, талака, узаемападтрымка.**

Зіма завалодала светам… Я хварэю, ляжу ў ложку. За вокнамі лютуе завіруха, у хаце цёпла; гарачыя і рукі маёй бабулечкі, якія ласкава мяне гладзяць. Я люблю выздараўліваць пад бабуліны 'сказы-апавяданні'.

…Даўно гэта было, калі яшчэ лясы былі непралазныя ды балоты глыбокія. Ішоў на нашу краіну злы хан Чырык, заваёўваў гарады, руйнаваў вёскі, таптаў урадлівыя палі. Наблізіўся страшны вораг і да нашай вёсачкі. Мужчынаў не было ў хатах, усе поле аралі. Заплакалі жанчыны, не ведалі, што рабіць, як ратавацца ад бяды. Тады стары мудры дзед даў параду. Выйшлі ўсе жанчыны і дзеці з люстэркамі, сталі насупраць сонца, накіравалі люстэркі на ворага. Асляпіла сонца і яркае шкло чужынцаў-заваёўнікаў, палічылі, што гэта дрэнны знак і пакінулі вёску, не захапілі. А назву вёска Білі атрымала ад слова "біць", гаварылі: пабілі тут Чырыка.

"Трэба жыць талакой, у згодзе," – засынаю я пад ласкавы голас бабулі.

Любім мы з ёй гартаць наш сямейны альбом, згадваць гісторыі пра прашчураў. "Вось паглядзі, Дашачка, гэта той домік, які пабудавалі талакой у 1946 годзе, пасля вайны, – апавядае бабуля. – У вёсцы засталося толькі некалькі дамоў, астатнія былі знішчаны падчас ліхалецця. Разам ваявалі, разам будавалі, дружна заўжды беларусы жылі…"

– Глядзі, унучачка, як я блінцы пяку, запамінай, – вучыць бабуля.

Блінцоў пячом многа: у нас традыцыя збірацца на сямейны абед усім разам у нядзелю. Прыязджаюць мае старэйшыя сястрычкі з пляменнікамі. Абмяркоўваем справы, дзелімся і радасцямі, і праблемамі. А пазней ідзём мы з бабуляй у госці да бабы Лёдзі (яна адзінокая, жыве адна), нясём гасцінцы і пачастункі. "Чалавек жыве сярод людзей і для людзей," – павучае бабулечка.

**Адзінства – гэта сувязь пакаленняў і захаванне традыцый.**

Вясна… Квітнее май, кружыць галаву пах бэзу… Мы з татам крочым у роўным страі Несмяротнага палка. У гарадскім пасёлку Воранава збіраецца многа людзей на свята Перамогі. Тата трымае партрэт прадзеда, Мерава Васіля

Уладзіміравіча, які прайшоў амаль усю вайну з 1942 года па 1945, быў тры разы паранены. У маіх руках сцяжок і чырвоныя цюльпаны. Сонейка ласкава саграває твары – чамусьці заўсёды, колькі я памятаю, на Дзень Перамогі, ясны дзень (магчыма, і ён радуецца разам з намі). Я адчуваю агульны дух сабраных людзей, радасць майго прадзядулі, што мы захоўваем гістарычную памяць пра Вялікую Айчынную вайну, пра подзвіг беларусаў, пра ахвяры фашызму.

Напамінам пра гераічны подзвіг савецкага народа ў той Вялікай Вайне з’яўляецца мноства помнікаў, абеліскаў, мемарыяльных комплексаў на карце роднай Беларусі. Гэта і напамін нам, і перасцярога, і гонар, што мы – нашчадкі пераможцаў.

“Міралюбівая наша зямля, здаўна ўсе жылі дружна, згодна – і беларусы, і палякі, і рускія, і яўрэі, і татары,” – расказвае нам былы наш настаўнік, краязнаўца  Рамуальд Бень. Любім мы, старшакласнікі Канвелішскай школы, вывучаць гісторыю родных мясцін. “Хацелася б, – просіць наш вопытны экскурсавод, – каб і вы прывялі сваіх дзяцей на Русалчын мост, Чортава месца, Тамашова поле, да Міклашова крыжа, бо тут жыве народная памяць, народны дух. Слухайце і паважайце старасць, чэрпайце мудрасць”.

**Адзінства – гэта ідэі і прынцыпы, якія  фарміруюць народ, нацыю.**

На вуліцы чаруе лета… Я адпачываю ў фальклорна-краязнаўчым лагеры “Канвалія”. Разам з намі – студэнты-філолагі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Фальклорная экспедыцыя прывяла нас у вёску Подзегуці. Менавіта тут мы пачулі гісторыю, якая нагадвае лёс Сымона Ракуцькі і яго сям’і з рамана Кузьмы Чорнага “Пошукі будучыні”.

…Янак і Ганна ўсё жыццё жылі па-суседску. Разам гулялі, працавалі, пасвілі каровак… Самі і не заўважылі, калі прыйшло каханне. Ажаніліся ў 1918 годзе. Складаны быў час, галодны. Паехаў Янак “шукаць хлеба” ў Расію. Засталася Ганна адна. Маленькі сыночак памёр ад хваробы. Ганна ж кожную нядзелю пасля імшы ў касцёле ішла на чыгуначную станцыю сустракаць Янку. Не разумела жанчына, што Рыжскі мірны дагавор падзяліў Беларусь на Заходнюю і Усходнюю, што складана вярнуцца мужу. Верыла ў спатканне Ганна. Не зважала на дождж і вецер, сумёты і холад, кожную нядзелю ішла сустракаць свайго любага. Ужо сівізна пакрыла скроні, а жанчына верыла – вернецца. Мясцовыя жыхары далі Ганне мянушку Нявеста. Вярнуўся Янак у 1939 годзе, толькі не дачакалася яго Ганна: памерла жанчына восенню 1938.

Мы, жыхары Заходняй Беларусі, радуемся новаму святу, якое з’явілася ў беларускім календары ў 2021 годзе,  – Дню народнага адзінства. 17 верасня – гэта не проста аб’яднанне тэрыторыі Беларусі, гэта магчымасць жыць адной супольнай сям’ёй, гаварыць і вучыцца на роднай мове, адчуваць сябе адзінай нацыяй, мець свой суверэнітэт і незалежнасць.

**Адзінства – гэта  згода, адзінагалоссе.**

Залатая восень раскідвае рознакаляровыя лісты, цешаць вока вяргіні і хрызантэмы… ‘Залатым’ узростам называюць і сталасць. Я разам з іншымі валанцёрамі дапамагаю на агародзе самай старэйшай жыхарцы аграгарадка Канвелішкі Сінкевіч Вользе Казіміраўне. Працуем дружна, хутка: збіраем моркву і буракі, носім у склеп. А пазней баба Волька расказвае нам пра сваё

жыццё і спявае песні. Мы таксама развучылі народную песеньку пра вяргіньку, што цвіце ля хаты. Песня прыгожа льецца па вуліцы, а баба Волька радуецца: “Дзякуй вам, дзяўчаткі, што песню вывучылі. Я памру, а песня застанецца. Бабуля мая яе спявала, матуля галасістая была, а цяпер вы будзеце спяваць пра працавітую Анюту, пра яе няшчаснае каханне і пра нашы вяргінькі…”

**Адзінства – гэта і ёсць адчуванне повязі пакаленняў, сваіх каранёў, гісторыі і традыцый, нацыянальных рысаў характару.**

Беларусы – народ талерантны, добры, працавіты. Гэтымі рысамі характару валодаюць і сённяшнія жыхары нашай сінявокай краіны. Нездарма ж кожную восень другога лістапада, на Дзяды, мы ідзём на могілкі, каб згадаць нашых прашчураў, папрасіць у іх парады і дапамогі, а яшчэ пераканаць іх у тым, што мы захоўваем памяць і традыцыі, “цвёрда трымаемся за свае карані”. Кожны прыносіць на могілкі многа лампадак, каб запаліць не толькі на магілцы родных і сваякоў, але яшчэ і тых, да каго не здолелі прыехаць блізкія. “Заўжды так было, колькі я сябе памятаю,” – згадвае матуля.

Гараць сотні лампадак-свечак – і разумееш, што гэты агонь і ёсць напамін-памяць пра род, пра тых, хто памёр, але застаўся назаўсёды з намі, бо ў нашых сэрцах іх кроў, мы працягваем іх памкненні, мы спраўджваем іх надзеі.

Жыццё бяжыць-мяняецца. Разам з ім буду мяняцца і я. Толькі назаўсёды мяне будуць жывіць тыя крыніцы, “з якіх пайшло маё выйсце”, дзе я сябе адчула часткай вялікага народа – беларусаў.